15 снежня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў XXIV з'езд Беларускага саюза мастакоў. Перад дэлегатамі выступіў міністр культуры Анатолій Маркевіч.

У прамове кіраўнік ведамства вызначыў асноўныя напрамкі супрацоўніцтва дзяржавы і Саюза мастакоў. Сярод гэтых кірункаў — сумесная праца над нарматыўнымі прававымі актамі, набыццё работ творцаў для фондаў музеяў, правядзенне выстаў, пленэраў і конкурсаў, стварэнне аб'ектаў манументальнага мастацтва, праца з моладдзю.

Гаворачы пра задачы БСМ на наступныя тры гады, міністр назваў найважнейшыя: праца над творамі мастацтва патрыятычнай тэматыкі, у тым ліку за кошт аднаўлення практыкі стварэння работ па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе, правядзенне выстаў і пленэраў, прысвечаных важным падзеям у жыцці Беларусі, падтрымка моладзі.

Кульмінацыйным момантам з'езда сталі выбары старшыні БСМ. Пераважнай большасцю галасоў на чарговае трохгоддзе пераабраны Глеб Отчык.